**ЦІ БУДЗЕ IT-УНІВЕРСІТЭТ У БДУ?**
Гутарка з в. а. дэкана ФПМІ Таццянай СОБАЛЕВАЙ, а таксама выкладчыкамі і студэнтамі факультэта
Стар. 2–3

**КРЭАТЫЎНАЕ НАВУЧАННЕ ДАПАМОЖА ПАДРЫХТАВАЦЬ ЮРЫСТАЎ**
Інтэрв'ю з загадчыцай кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права Аксанай ЗДРОК
Стар. 4

**АДУКАЦЫЙНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ**
Якія галоўныя крытэрыі для ўдзелу, тлумачыць каардынатар міжнародных праектаў БДУ Арцём НАЗАРАНКА
Стар. 5

**ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ ШКОЛЬНУЮ АДУКАЦЫЮ**
Раскажаем пра ўнікальны праект «Настаўнік для Беларусі»
Стар. 6



Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ



*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

30 кастрычніка 2019 года, № 13 (2219)


СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Ганаровае сяброўства

Шэраг дакументаў, якія ўмацоўваюць навукова-адукацыйнае супрацоўніцтва БДУ і МДУ імя М. В. Ламаносава, падпісалі рэктары ўніверсітэтаў **Андрэй КАРОЛЬ** і **Віктар САДОЎНІЧЫ.**

Адметнай падзеяй стала заключэнне мемарандума пра заснаванне **«Ганаровага знака Сяброўства МДУ і БДУ»**, які будзе прысуджацца за адмысловыя заслугі ва ўмацаванні расійска-беларускага гуманітарнага супрацоўніцтва, актыўную працу па развіцці навукі і адукацыі, а таксама дабрачынную дзейнасць і вялікі ўнёсак у рэалізацыю сумесных праектаў Расіі і Беларусі.

Ганаровы знак уяўляе сабою ордэн з выявай аб'яднанай сімволікі двух ВНУ. Малюнак размешчаны на сінім фоне ў чырвоным вобадзе з надпісам «Сяброўства МДУ і БДУ». Апраўлены знак у васьміпрамянёвую зорку. Узнагарода выканана ў вялікім і лацканным фармаце для паўсюднага нашэння.

Першымі намінантамі на ўручэнне Ганаровага знака стануць дзесяць навукоўцаў БДУ і МДУ, імёны якіх вызначаць хуткім часам. Уручэнне дадзенай узнагароды будзе праходзіць штогод.

Другі дакумент прапісвае стварэнне **серыі «Прац МДУ і БДУ»**.




Сумесны міжуніверсітэцкі выдавецкі праект накіраваны на далейшае развіццё публікацыйнай актыўнасці і абмен навуковым і метадычным досведам навукоўцаў двух ВНУ. Серыя прац мяркуе выданне манаграфій, навучальнай літаратуры, зборнікаў навуковых артыкулаў і інш.

Усе матэрыялы будуць размешчаны ў навуковай электроннай бібліятэцы eLIBRARY. Акрамя таго, разглядаецца пытанне ўключэння навуковага выдання ў базу дадзеных РІНЦ і прысваення міжнароднага кніжнага нумара ISBN.

Цырымонія падпісання дакументаў адбылася ў рамках Дзён сяброўства МДУ імя М. В. Ламаносава і БДУ, якія праходзілі з 9 па 11 кастрычніка ў Маскве. Удзельнікам маштабнай падзеі стала дэлегацыя БДУ ў складзе дэканаў і навукоўцаў гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў.

Таксама ў гэтыя дні рэктары Андрэй Кароль і Віктар Садоўнічы ўзнагародзілі пераможцаў **V Міжнароднага расійска-беларускага конкурсу студэнцкіх навуковых прац па гісторыі** «Агульны шлях да Вялікай Перамогі. Подзвіг народаў несмяротны».

Дыпломаў I ступені за працу «Брэсцкі ўмацаваны раён у матэрыялах нямецкай разведкі, ваенных дакументах і ацэнцы спецыялістаў» ганараваны чацвёртакурснік БДУ *Уладзімір Узнясенскі*, а таксама магістрант МДУ імя М. В. Ламаносава *Аляксей Здзіркоў* за навуковую працу «Рэлігійныя дыскусіі ў рускім грамадстве ў канцы XV – пачатку XVI стагоддзя і станаўленне Расійскай дзяржавы».

За даследаванні «Роля жанчыны ў сацыяльна-эканамічным развіцці Візантыі» і «„Армянскае пытанне“ ва ўспрымванні Дыны Абгар» дыпломы II ступені ўручаны студэнтцы чацвёртага курса БДУ *Марце Пупач* і магістранту МДУ *Ганне Матэвасянт* адпаведна.

Акрамя таго, студэнт чацвёртага курса БДУ Уладзімір Узнясенскі заахвочаны спецыяльнай прэміяй Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі Беларусаў Расіі «За найлепшую студэнцкую навуковую працу па расійска-беларускай гісторыі».

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

БДУ Ў СВЕЦЕ

## БДУ ў два разы палепшыў пазіцыі ў амерыканскім рэйтынгу «Найлепшыя ўніверсітэты свету»

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт стаў адзінай айчыннай ВНУ, уключанай у базу дадзеных амерыканскага рэйтынгу Best Global Universities (BGU).

Чарговы выпуск апублікаваны 23 кастрычніка. Паводле вынікаў, БДУ размясціўся на 346 радку, падняўшыся на 351 пазіцыю ў параўнанні з леташнім паказчыкам. Сярод еўрапейскіх ВНУ БДУ займае 153 месца. Таксама вядучая беларуская ВНУ ўключана ў прадметныя рэйтынгі па фізіцы і хіміі, дзе ёй адведзены 129 і 553 пазіцыі адпаведна. Усяго BGU ацэньвае 1500 універсітэтаў з 81 краіны, што складае каля 5 % ад усіх існых 30 000 ВНУ свету.

Сярод краін СНД БДУ займае 2 месца, саступіўшы толькі МДУ імя М. В. Ламаносава (266). Адносна ўніверсітэтаў суседніх краін беларуская ВНУ з'яўляецца пятай пасля МДУ, Варшаўскага ўніверсітэта (286), Універсітэта Тарту (322) і Ягелонскага ўніверсітэта (343).

Узначалілі рэйтынг традыцыйна амерыканскія ВНУ – Гарвардскі ўніверсітэт, Масачусецкі інстытут тэхналогій і Стэнфардскі ўніверсітэт.

Неабходнай умовай уключэння ў рэйтынг з'яўляецца наяўнасць больш чым 1500 публікацый у навукаметрычнай базе дадзеных Web of Science за пяць гадоў. У бягучым выпуску прааналізаваны звесткі за 2013–2017 гады. Рэзкі рывок БДУ стаў магчымым дзякуючы павелічэнню колькасці артыкулаў навукоўцаў БДУ, апублікаваных у міжнародных навуковых часопісах Web of Science. Гэта лічба на дадзены момант роўная 3049 дакументам, што значна апярэджвае вынікі іншых беларускіх ВНУ. З прадстаўленай колькасці прац 123 патрапілі ў 1 % найлепшых артыкулаў свету па колькасці цытаванняў. Дарэчы, трэцяя частка ўсіх беларускіх публікацый, уключаных у Web of Science, належыць навукоўцам БДУ.

Амерыканскі рэйтынг Best Global Universities складаецца на працягу 30 гадоў медыякампаніяй U.S. News&World Report. Да 2014 года ранжыраваліся толькі амерыканскія ВНУ. Пасля кампанія пашырыла геаграфію ўніверсітэтаў. На дадзены момант міжнародны глабальны рэйтынг уключае таксама 28 прадметных і 5 рэгіянальных пералікаў.

Усяго існуе больш за 20 разнастайных глабальных рэйтынгаў. БДУ ўдзельнічае ў рэйтынгах 12 агенцтваў. Дарэчы, у чэрвеньскай версіі QS БДУ размясціўся на 351 пазіцыі, што адпавядае ўваходжанню ў 1,5 % найлепшых універсітэтаў свету.



УНІВЕРСІТЭТ
30 кастрычніка 2019 года, № 13 (2219)

# Ці будзе IT-універсітэт у БДУ?



**У нашай краіне разгарнулася дыскусія пра тое, якім павінен быць новы IT-універсітэт, анансаваны главой дзяржавы. Кіраўніцтва БДУ прапанавала стварыць такую ўстанову на базе факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, паколькі ён дае магчымасць фундаментальнай шматпрофільнай падрыхтоўкі спецыялістаў у інавацыйна-адукацыйным асяроддзі, а таксама валодае неабходнымі кадравымі рэсурсамі.**

*Па каментарыі мы звярнуліся да в. а. дэкана ФПМІ **Таццяны СОБАЛЕВАЙ,** а таксама пацікавіліся меркаваннем выкладчыкаў і студэнтаў факультэта.*



***– Таццяна Валянцінаўна, што неабходна для стварэння новай IT-ВНУ на базе ФПМІ і якія ў вас ёсць для гэтага магчымасці?***

– Перш за ўсё хочацца сказаць, што факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі 1 красавіка 2020 года адзначае свой 50-гадовы юбілей. За гэты час факультэт падрыхтаваў больш за 11 тысяч спецыялістаў, якія складаюць кадравую аснову шматлікіх вядучых арганізацый краіны ў галіне інфармацыйных тэхналогій і адпаведных падраздзяленняў у прамысловых прадпрыемствах, у тым ліку ў Парку высокіх тэхналогій (ПВТ), навуковых устаноў, банкаў, страхавых кампаній, навучальных устаноў. Факультэт рэалізуе больш за 100 дамоў аб узаемадзеянні з IT-прадпрыемствамі. Да выкладання прыцягваюцца дасведчаныя і паважаныя сусветнай супольнасцю члены-карэспандэнты, прафесары і дацэнты, якія спалучаюць педагагічную дзейнасць з навуковымі даследаваннямі па прыярытэтных кірунках навукі і тэхнікі, а таксама маладыя супрацоўнікі, што працуюць у кампаніях-рэзідэнтах ПВТ. Варта падкрэсліць, што маладыя спецыялісты, якія прыцягваюцца да навучальнага працэсу, з'яўляюцца выпускнікамі ФПМІ, прычым большасць з іх – лаўрэаты прэміі спецфонду Прэзідэнта РБ па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, удзельнікі чэмпіянатаў свету па праграмаванні і матэматыцы. Мы б хацелі, каб найлепшыя выпускнікі пасля заканчэння БДУ заставаліся ў нас на выкладчыцкай і навуковай працы. Галоўнай перашкодай з'яўляецца вельмі вялікая дыспрапорцыя ў аплаце працы ў IT-галіне і ў ВНУ.

Прыцягненне перспектыўных, таленавітых дзяцей у якасці студэнтаў ФПМІ вядзецца са школьнай парты. Нельга не сказаць пра тую актыўную прафарыентацыйную працу, якая ажыццяўляецца ў рамках навукова-даследчага і навучальна-метадычнага цэнтра выкладчыкаў і навучэнцаў («ЮНІ-цэнтр-XXI»). Школы юных ФПМІ БДУ навучаюць больш за 1000 школьнікаў з 5 па 11 класы, пасля чаго найлепшыя з іх становяцца студэнтамі ФПМІ.

Часта чуеш пытанне: «Што адрознівае выпускнікоў ФПМІ ад выпускнікоў іншых ВНУ?» Факультэт рыхтуе сістэмных аналітыкаў, здольных вырашаць задачы ў розных галінах эканомікі – ад пастаноўкі задачы да рэалізацыі гатовага праграмнага прадукта. Акрамя таго, нашы студэнты атрымліваюць паглыбленыя веды ў розных галінах матэматыкі, неабходных для мадэлявання працэсаў, распрацоўкі алгарытмаў і стварэння сістэм рознага прызначэння. Факультэт ганарыцца сваімі выпускнікамі, але, на жаль, не ўсім студэнтам удаецца атрымаць запаветны дыплом спецыяліста, бо яны пачынаюць рана працаваць у IT-галіне, выконваюць не самую кваліфікаваную, але добра аплачваную працу, паступова страчваюць цікавасць да атрымання фундаментальных ведаў.

Варта адзначыць, што якасная фундаментальная падрыхтоўка спецыялістаў немагчымая без навуковых школ. Супрацоўнікі факультэта праводзяць навуковыя даследаванні па найважнейшых праблемах тэарэтычнай і прыкладной інфарматыкі і матэматыкі, арыентаваных на прыярытэтныя кірункі фундаментальных і прыкладных даследаванняў. На факультэце функцыянуе сем навуковых школ, якія склаліся на працягу больш чым чатырох дзесяцігоддзяў і ўзначаленыя вядучымі навукоўцамі сусветнага ўзроўню, што маюць высокія паказчыкі публікацыйнай актыўнасці. Вынікі навуковых распрацовак і прыкладныя сістэмы ўкаранёныя ў розныя ўстановы і арганізацыі (Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі, РУП «Белдзяржлес», Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, ААТ «Беларуськалій» і інш.) і выкарыстоўваюцца для рашэння задач у галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, судовай медыцыны, дыягностыкі і лячэння артапедычных захворванняў, правядзення экстранных хірургічных аперацый і г. д. Напрыклад, адна з сістэм – «Орта-Эксперт» – выкарыстоўвалася медыцынскай службай зборнай каманды Беларусі пры падрыхтоўцы і непасрэдна ў перыяд правядзення Алімпійскіх гульняў у Пекіне. На базе факультэта пры рэалізацыі інавацыйнага праекта па фарміраванні новай мадэлі працы ўніверсітэцкай кафедры створаны і паспяхова развіваецца навукова-адукацыйны кластар «Вялікія інфармацыйныя сістэмы».

ФПМІ актыўна ўдзельнічае ў інавацыйным развіцці краіны, супрацоўнічаючы як з глабальнымі IT-вендарамі (Cisco, IBM, SAP, Oracle, Microsoft, лабараторыя Касперскага, 1С), вядучымі IT-кампаніямі ПВТ (IBA, EPAM, «Ітранзішн» і інш.), так і з прадпрыемствамі рэальнага сектара эканомікі (група кампаній «Санта», група кампаній BelWest, СТАА «Натывіта») у рамках іх адукацыйных ініцыятыў. Пры падтрымцы спонсараў на факультэце адкрываюцца новыя лабараторыі (SAP Next-Gen Lab – май 2019, цэнтр робататэхнікі і штучнага інтэлекту – лістапад 2019), праводзяцца хакатоны, стартапы і праектныя семінары, якія дапамагаюць студэнтам развіваць крэатыўныя і прадпрымальніцкія навыкі.

Высокія вынікі на алімпіядах і конкурсах у канкурэнтнай барацьбе доказваюць слушнасць метадаў і праграм навучання, а таксама патэнцыял прафесарска-выкладчыцкага складу.

***– Для студэнтаў IT-спецыяльнасцяў надзённай з'яўляецца праблема матывацыі да навучання на старэйшых курсах. Якімі перспектывамі можна зацікавіць людзей, якія маюць прывабныя варыянты працаўладкавання, для паступлення ў магістратуру і аспірантуру?***

– Перспектыва атрымаць дадатковыя веды, вучыцца ў зацікаўленых і прафесійных выкладчыкаў, мець магчымасць навучання па сумесных магістарскіх праграмах з вядучымі еўрапейскімі ВНУ – гэта тыя моманты, якія дазваляюць далучаць студэнтаў да навучальнага працэсу. На ФПМІ магістарскімі праграмамі займаюцца некалькі прафесійных калектываў. Усе магістарскія праграмы маюць агульныя дысцыпліны (дзяржаўны кампанент), якія забяспечваюць падмурак навучання, а далей уключаюцца ў канкрэтныя кірункі (прафілізацыі). У дзяржаўны кампанент уключаны чатыры найважнейшыя модулі, кожны з якіх закрывае адзін з прыярытэтных кірункаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, запатрабаваных у РБ: прыкладная матэматыка, алгарытміка, інфарматыка, навуковыя даследаванні. Навучальныя планы распрацаваны з улікам пераемнасці ведаў, атрыманых на першай ступені вышэйшай адукацыі, выключаючы іх дубляванне.

У якасці прыкладу разгледзім арганізацыю навучальнага працэсу для прафілізацыі «алгарытмы апрацоўкі вялікіх дадзеных» у рамках спецыяльнасці магістратуры «прыкладная матэматыка і інфарматыка», якая карыстаецца найбольшай папулярнасцю ў абітурыентаў (у 2019/2020 навучальным годзе набор на прафілізацыю склаў 30 чалавек). Пасля вывучэння самых прэстыжных магістарскіх праграм сусветнага ўзроўню і аналізу запатрабаваных кампетэнцый была створана складаная практыка-арыентаваная, але з глыбокай тэарэтычнай падрыхтоўкай магістарская праграма. Навучальны працэс арганізаваны так, што фундаментальныя дысцыпліны чытаюць выкладчыкі факультэта, а для выкладання дысцыплін, якія актыўна выкарыстоўваюцца ў індустрыі, запрашаюцца прафесіяналы-практыкі з вядучых IT-кампаній, пры гэтым улічваюцца пажаданні студэнтаў. Напрыклад, вялікая частка студэнтаў магістратуры працуе, таму заняткі праводзяцца галоўным чынам у вячэрні час. Што да навучальных заданняў, яны суправаджаюцца практычнымі тлумачэннямі і рэкамендацыямі, маюць строгія часавыя рамкі для выканання, затым якасна правяраюцца і абмяркоўваюцца з магістрантамі, бо нашы выкладчыкі лічаць, што на сумленных зносінах і ўзаемапавазе паміж студэнтамі і выкладчыкамі і будуецца эфектыўнае навучанне.

**ПЫТАННЕ СТУДЭНТАМ:**

***– Наколькі, на ваш погляд, неабходная сучасным IT-спецыялістам шматпрофільная вышэйшая адукацыя? Якой павінна быць праграма навучання ў IT-ВНУ?***



**Андрэй НЯВЕРА, 2 курс**

– Сучаснае праграмаванне, як і шматлікія іншыя галіны, не існуе само па сабе, адасоблена ад усяго. Нават калі праграміст не з'яўляецца прафесарам фізіка-матэматычных навук ці першакласным аналітыкам, ён павінен умець узаемадзейнічаць з экспертамі ў адпаведных сферах. Фундаментальныя веды ў сумежных з праграмаваннем галінах з'яўляюцца неабходнай умовай прадуктыўнасці падобнага ўзаемадзеяння. Менавіта таму падрыхтоўка IT-спецыяліста павінна ўключаць азнаямленне з блізкімі да галіны дысцыплінамі.

Відавочны прыклад: праграмаванне вельмі цесна перасякаецца з матэматыкай. Адпаведна, праграма навучання IT-спецыяліста павінна ўключаць, прынамсі, яе базавыя раздзелы, такія як лінейная алгебра, дыскрэтная матэматыка, тэорыя верагоднасцяў і матэматычная статыстыка.

Падрыхтоўка праграміста менавіта як IT-спецыяліста таксама павінна мець фундаментальны ўхіл. Кваліфікаванаму распрацоўшчыку варта ўмець аналізаваць агульную карціну, разумець асноўныя падыходы да рэалізацыі тых ці іншых праграмных рашэнняў і ўжо на базе гэтых ведаў прымаць рашэнне пра мэтазгоднасць выкарыстання, напрыклад, таго ці іншага фрэймворка ў рамках сваёй бягучай задачы. Такі спецыяліст будзе заставацца запатрабаваным даволі доўгі час, бо ён зможа гнутка падладжвацца пад галіну, якая ўвесь час развіваецца.



**Дзмітрый КАРШАКЕВІЧ, 2 курс**

– Са свайго не вельмі вялікага, але здабытага сумленнай працай досведу, магу заявіць, што IT-адукацыя павінна быць суровай і бязлітаснай.







Безумоўна, у гэтай сферы шмат цікавых рэчаў, якія лёгка і прыемна вучыць, але тоны строгіх матэматычных доказаў, алгарытмаў і асэмблернага кода – гэта тое, да чаго пры самастойным вывучэнні чалавек можа ніколі і не дабрацца, і тым не менш дае сапраўды шырокі погляд на тое, што ты робіш, і шматкроць павялічвае твой патэнцыял. І мала таго, што для сапраўднага развіцця трэба часам вучыць тое, што не хочацца, дык яшчэ і ў тым тэмпе, у якім не хочацца!

Што ж тычыцца шматпрофільнай вышэйшай адукацыі, то, як мне здаецца, усебаковае развіццё неабходна любому адукаванаму чалавеку. У нашым жа выпадку, калі праграміст захоча стварыць высокатэхналагічны стартап, то, якім бы таленавітым ён ні быў, без элементарных ведаў эканомікі справы наўрад ці пойдуць вельмі гладка.



**Андрэй ІЛЫН, магістрант**

– На мой погляд, будаваць адукацыйны працэс лепш паэтапна. Спачатку, на першых курсах, вывучыць агульны для ўсіх набор дысцыплін – тэхнічных, матэматычных і гуманітарных – для пашырэння далягляду. Не магу сказаць, што я вялікі знаўца матэматыкі, але згодны з каштоўнасцю матэматычных дысцыплін і карыснасцю гуманітарных (адзінае, што б я змяніў, гэта прыбраў бы іспыты па іх, пакінуўшы толькі залікі).

На тэхнічных дысцыплінах трэба выпрацаваць разуменне таго, як наогул працуюць праграмы і камп'ютары, як адбываецца ўзаемадзеянне працэсаў у ім, вывучыць асновы некалькіх моў праграмавання (у гэтым плане бягучая праграма з C++, Asm і Java цалкам нядрэнная). Пры гэтым, на мой погляд, трэба павышаць каштоўнасць такіх дысцыплін у вачах студэнтаў, а таксама колькасць гадзін у курсе праграмавання – як-ніяк, далей усе тэхнічныя дысцыпліны залежаць ад гэтай.

Яшчэ цікавай ідэяй здаецца падзел на кірункі па інтарэсах – у адной групе паглыблена вывучаць тэхнічныя прадметы, у іншай – матэматыку, у трэцяй – абодва прадметы на павышаным узроўні. Такі падыход ужо некалькі гадоў практыкуецца ў Вышэйшай школе эканомікі і даволі нядрэнна сябе зарэкамендаваў. Яно і зразумела: розніца ў пачатковым узроўні праграмавання ў першакурснікаў проста каласальная, гэта вельмі добра заўважна, калі пачынаеш выкладаць. У такой сітуацыі арыентавацца на слабых – дрэнна, бо моцныя засумуюць, наадварот – слабыя нічога не будуць разумець. Такім чынам, здаецца правільным, калі ў студэнтаў ёсць магчымасць выбару, які прадмет больш паглыблена вывучаць, грунтуючыся на сваіх наяўных ведах і інтарэсах.

Развіваючы гэту ідэю, мэтазгодна для IT-ВНУ на старэйшых курсах рабіць яшчэ больш разнастайны падзел: камусьці падабаецца сістэмнае праграмаванне, камусьці frontend, хтосьці ўсё жыццё марыў аналізаваць дадзеныя на Python. Пры гэтым я не гавару, што варта выключаць іншыя прадметы з курса – кожны высакакласны спецыяліст павінен мець уяўленне і мінімальны досвед ва ўсіх кірунках, каб у галаве была цэласная карціна – толькі так можна вырашаць складаныя шматузроўневыя задачы і арганізоўваць узаемадзеянне паміж людзьмі, якія працуюць на розных узроўнях. Гаворка тут менавіта пра паглыбленае вывучэнне, для якога, дарэчы, варта абавязкова прыцягваць людзей з індустрыі, якія ў курсе сучасных тэндэнцый у той ці іншай галіне.

У такой сістэме магістратура выглядае як яшчэ адна ступень паглыблення, калі колькасць агульных прадметаў паміж кірункамі ўжо становіцца мінімальнай. На гэтым этапе чалавек ужо будзе мець цэласнае ўспрыманне ўсяго, абярэ канкрэтны кірунак для будучай дзейнасці і зможа аддаць максімум часу толькі таму, што цікава больш за ўсё.

Заўважу таксама, што ў такой сістэме варта выяўляць гнуткасць ва ўсім. У прыватнасці, варта прадугледжваць магчымасць змены кірунку для паглыбленага вывучэння, бо часам складана зразумець, наколькі тое ці іншае цікава, пакуль не паспрабуеш улезці ў гэта «з галавой». Напрыклад, магу сказаць пра сябе. Я пасля другога курса паступіў у Школу аналізу дадзеных (Yandex)... не столькі таму, што было цікава штосьці, а хутчэй ад нуды і жадання вывучаць штосьці новае на ўзроўні вышэйшым за ўніверсітэцкую праграму. Пры гэтым я не асабліва разумеў, што мяне чакае і ці будзе мне гэта цікава. І вось ведаеце, нягледзячы на наяўнасць шэрагу займальных курсаў па C++, алгарытмах і эўрыстыках, я зразумеў, што так папулярнае сёння машыннае навучанне, якому прысвячалася вялікая частка курсаў там, мне ўвогуле не цікавае. Не скажу, што шкадую пра паступленне – зусім не, але даволі нечакана атрымалася, згадзіцеся :)

Яшчэ лічу мэтазгоднымі стажыроўкі студэнтаў у розных кампаніях падчас вучобы, каб яны маглі і замацаваць навыкі, і атрымаць каштоўны досвед і знаёмствы. Цяпер гэта складана зрабіць – нават калі ахвяраваць вакацыямі, гэта ўсяго 2 месяцы, а стажыроўкі звычайна месяцы па 3. Пры гэтым я гавару менавіта пра летнія стажыроўкі, а не пра паўнавартасную працу падчас навучальнага года, тут у мяне меркаванне якраз процілеглае – сумяшчаць яе з вучобай на паглыбленым узроўні мне падаецца немагчымым. Не варта гнацца за лёгкім прыбыткам, напрацавацца IT-спецыяліст заўсёды паспее, а вось неабходныя веды і навыкі, пры належным узроўні выкладання, цяжка набыць самастойна.

***– Ці маюць магчымасць вашы студэнты атрымаць акрамя прафесійных навыкаў так званыя soft skills – уменне працаваць у калектыве, веды псіхалогіі, уменне кіраваць праектамі, іншыя падобныя навыкі, неабходныя для калектыўнай творчасці?***



**Сяргей МАРКАЎ, загадчык кафедры шматпрацэсарных сістэм і сетак**

– Так, маюць. На кафедры ўжо на працягу некалькіх гадоў пры падрыхтоўцы курсавых і дыпломных праектаў студэнты аб'ядноўваюцца ў міждысцыплінарныя каманды з ментарамі ад вядучых IT-кампаній Беларусі, якія праходзяць свой шлях ад ідэі да прататыпа і адточваюць майстэрства ў шматлікіх IT-спаборніцтвах, такіх як хакатоны БДУ 2015, 2018, 2019, SAP Leonardo Hackaton 2018 пры падтрымцы Velcom, БДУ + SAP Хакатон 2019 пры падтрымцы групы кампаній IBA, міжнародная алімпіяда «IT-планета», конкурсах і фэстах: фэст адукацыйных тэхналогій Startup Edutech Fest, міжнародны конкурс стартап-праектаў BizTech BSU StartUp Contest, рэспубліканскі конкурс «Паскарэнне».

Са студэнтамі ФПМІ праводзяцца інтэнсіўныя заняткі па псіхалогіі працы ў камандзе, эфектыўным кіраванні праектамі, дызайн-мысленні для аналізу і візуалізацыі вынікаў сумеснай працы, а таксама камерцыялізацыі вынікаў праектнай дзейнасці. На кафедры распрацаваны і прачытаны студэнтам спецыяльнасці «інфарматыка» спецкурс «Бізнес-аналіз у распрацоўцы ПА» (Канстанцін Мулярчык), які дазваляе асвоіць і набыць адпаведныя кампетэнцыі па шматлікіх з пералічаных вышэй пытаннях.

**Падрыхтаваў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**01 лістапада Усоўская Эліна Аркадзьеўна,** загадчыца кафедры культуралогіі, факультэт сацыякультурных камунікацый

**01 лістапада Яцэвіч Кацярына Аляксандраўна,** дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай, факультэт міжнародных адносін

**02 лістапада Толсцік Аляксей Леанідавіч,** загадчык кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі, фізічны факультэт

**04 лістапада Давідовіч Ганна Аляксандраўна,** дацэнт кафедры псіхалогіі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

**04 лістапада Каклеўскі Аляксандр Уладзіміравіч,** дацэнт кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі

**07 лістапада Саскевіч Вераніка Васільеўна,** дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права, юрыдычны факультэт

**09 лістапада Дзенісенка Марына Аляксандраўна,** дацэнт кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, факультэт міжнародных адносін

**11 лістапада Піндрык Вольга Іосіфаўна**, дацэнт кафедры функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі, механіка-матэматычны факультэт

**11 лістапада Фафанава Галіна Аляксандраўна,** дацэнт кафедры псіхалогіі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

**12 лістапада Ротман Давід Генрыхавіч,** дырэктар цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў

**16 лістапада Гуліс Ігар Міхайлавіч,** прафесар кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі, фізічны факультэт

**18 лістапада Лысава Наталля Багданаўна,** дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі, факультэт журналістыкі

**18 лістапада Пугачоў Васіль Паўлавіч,** прафесар кафедры міжнароднага менеджменту, эканамічны факультэт

**21 лістапада Нічык Марыя Мікалаеўна,** дацэнт кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, хімічны факультэт

**28 лістапада Малафееў Вячаслаў Міхайлавіч,** дэкан факультэта даўніверсітэцкай адукацыі

**28 лістапада Паваляеў Сяргей Анатольевіч,** дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

**29 лістапада Дзюбкова-Жарнасек Таццяна Пятроўна,** дацэнт кафедры экалогіі чалавека, факультэт сацыякультурных камунікацый

**29 лістапада Ляшчынская Ірына Іванаўна,** дацэнт кафедры філасофіі культуры, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: канстытуцыйнага права, крымінальнага права, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм, інтэлектуальных сістэм, тэлебачання і радыёвяшчання, медыялогіі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, фізікі цвёрдага цела, медыялогіі, тэлебачання і радыёвяшчання, мікрабіялогіі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: крыніцазнаўства, медыялогіі, біяфізікі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнага выхавання і спорту, батанікі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36.*

**РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ моладзевай палітыкі і сацыякультурных камунікацый;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: кіравання і эканомікі вышэйшай школы, псіхалогіі і педагагічнага майстэрства (2), філасофіі і метадалогіі ўніверсітэцкай адукацыі;

СТ. ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ сучаснага прыродазнаўства.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, пакой 219, тэл. 200 91 07.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Інтэрв'ю рэктара БДУ Андрэя Караля пра падрыхтоўку IT-спецыялістаў і мадэль новай ВНУ** – sb.by, «СБ. Беларусь сегодня », 1prof.by (23.10).

**Першы Беларуска-турэцкі міжуніверсітэцкі форум прайшоў у БДУ** – БелТА, sb.by, «Экопресс» (01.10), АНТ, edu.gov.by, belarus.by (02.10), «Настаўніцкая газета» (05.10 ).

**Навукова-тэхнічная экспазіцыя БДУ прадстаўлена на II Форуме рэгіёнаў Украіны і Беларусі** – БелТА, sb.by, zviazda.by, yandex.by, grodnonews.by, news.21.by, theworldnews.net (01.10), «Мінск-Навіны», region.grodno.by, cis.minsk.by, volozhin.gov.by, novgazeta.by, vitbichi.by (03.10).

**Стыпендыі Wargaming атрымалі студэнты БДУ** – БелТА, sb.by, zviazda.by, «Мінск-Навіны», TUT.BY, news.21.by, theworldnews.net, mail.ru, aif.by, belmir.by (04.10).

**Конкурс дзіцячай журналістыкі «Старт» арганізаваны ў БГУ** – БелТА, grodnonews.by, pvlida.by, news.21.by, m.radiogomelfm.by, voran.by (03.10), zviazda.by (06.10), «Звязда» ( 08.10).

**Дні дружбы МДУ імя М. В. Ламаносава і БДУ і Першы форум Асацыяцыі ВНУ Расіі і Беларусі** – sb.by (08.10), БелТА, zviazda.by, «Спадарожнік», «Інтэрфакс», souzveche.ru, belros.tv (09.10), belnovosti.by, embassybel.ru, edu.gov.by, academica.ru, rosbelsoyuz.su, «Саюз. Беларусь – Расія» (10.10), АНТ, soyuz.by, sozh.info (12.10).

**БДУ ўвайшоў у 1% найлепшых універсітэтаў краін Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі** – БелТА, sb.by, zviazda.by, «Мінск-Навіны», «Спадарожнік», «Экопресс», tut.by, souzveche.ru, belnovosti.by, belarus.by, aif.by, voran.by (15.10).

**Студэнцкая каманда БДУ заваявала ўзнагароды рознай вартасці на XII Міжнароднай алімпіядзе «IT-Планета 2018/2019»** – БелТА, «Мінск-Навіны», «Спадарожнік», aif.by, belnovosti.by, iba.by, by.utro.news (17.10)

**БДУ ў два разы палепшыў сваю пазіцыю ў амерыканскім рэйтынгу Best Global Universities** – БелТА, sb.by, zviazda.by, БТ-1, «Спадарожнік», «Мінск-Навіны», Беларусь-24, belnovosti.by, (24.10), АНТ (25.10).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
30 кастрычніка 2019 года, № 13 (2219)

# Крэатыўнае навучанне

## дапаможа падрыхтаваць юрыстаў, якія вырашаюць спрэчкі ў пазасудовым парадку

Загадчыца кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта **Аксана ЗДРОК** атрымала прэмію імя У. І. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук за цыкл прац, якія абгрунтоўваюць канцэпцыю прававога рэгулявання прымірэнчых працэдур як сродку павышэння эфектыўнасці правасуддзя па грамадзянскіх і эканамічных справах. Яе даследаванне паўплывала на сістэму судаводства ў краіне. Мы даведаліся, як прымірэнчыя працэдуры ўздзейнічаюць на ход судовай справы, а таксама як эўрыстычныя метады здольныя выгадаваць патрэбнага спецыяліста для юрыдычнай галіны.


Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

*Аксана Здрок выкладае медыяцыю з дапамогай эўрыстычных заданняў. Яна адзначае: "Падчас падобных заняткаў няма ніводнага сумнага студэнта, усе ўключаны ў працу"*

### «Медыятар – гэта перакладчык, які валодае мовай канфліктнай сітуацыі»

«Тэму прымірэнчых працэдур вывучаю даўно. Калі збірала матэрыял для навучальнага курса па грамадзянскім працэсе ў замежных краінах, то выявіла, што большасці дзяржаў знаёмая такая з'ява, як прымірэнчыя працэдуры. Яны ўкараняліся ў судовы працэс, каб памірыць бакі без вынясення судовага рашэння. Гэта пытанне зацікавіла, захацелася ў ім дэталёва разабрацца», – распавядае Аксана Мікалаеўна пра пачатак вывучэння тэмы, праца над якой заахвочана прэміяй імя Пічэты.

Як адзначае выкладчык, пералік падобных працэдур вялікі: міравая дамова, перамовы, медыяцыя... Апошняя стала самай папулярнай у Беларусі. Яе асновам Аксана Мікалаеўна навучалася ў Германіі (у рамках стажыроўкі, арганізаванай Германскім фондам міжнароднага прававога супрацоўніцтва), потым знаёмілася з расійскай мадэллю медыятыўнай тэхналогіі на факультэце філасофіі ў Санкт-Пецярбургу.

«Вышэйшы гаспадарчы суд РБ у 2010 г. запусціў пілотны праект пра ўкараненне медыяцыі ў практычную дзейнасць. Я брала ўдзел у праекце. Тады ў будынку гаспадарчага суда Мінска быў пакой прымірэння, дзе мы дзяжурылі як медыятары. Бакі, якія спрачаюцца, ішлі па прапанове суда ў пакой медыятараў (працавалі па 2–3 спецыялісты). Гэта было новым, прысутнічала хваляванне. Затым ужо была асобная практыка, справы былі самыя розныя. Напрыклад, адна жанчына, якая займаецца гадоўляй кацянят, прасіла дапамагчы правесці перамовы. Яна прадала кацяня, а яно доўга не пражыло ў новых гаспадароў. Тыя заявілі, што не толькі спагоняць з яе матэрыяльную і маральную шкоду, але і яшчэ і «закрыюць» яе дзейнасць. Жанчына была напалоханая. Перамовы па ўрэгуляванні гэтай сітуацый далі станоўчы вынік», – гаворыць медыятар.

Паралельна з практычнай дзейнасцю ішла і навуковая праца, якая абмяжоўвалася не толькі напісаннем артыкулаў. Аксана Здрок была навуковым кіраўніком задання «Канцэптуальныя асновы павышэння эфектыўнасці правасуддзя пасродкам выкарыстання сістэмы прымірэнчых працэдур» ДКПНД «Эканоміка і грамадства». Грунтоўная навуковая справаздача лягла ў аснову праекта закона пра медыяцыю. Увесь сабраны матэрыял быў настолькі вялікі, што менавіта гэтую тэму практык абрала для сваёй доктарскай дысертацыі.

На працягу 2008–2013 гг., калі Аксана Мікалаеўна працавала ў Нацыянальным цэнтры заканадаўства і прававых даследаванняў РБ, яе дзейнасць была звязана з падрыхтоўкай законапраектаў. У прыватнасці, яна прапанавала прыняцце ў Беларусі па прыкладзе замежных дзяржаў закона аб медыяцыі. Гэта прапанова знайшла водгук праз пару гадоў, калі ў сістэме гаспадарчых судоў адбыўся значны рост спраў. «Судовая сістэма стала шукаць магчымасці зменшыць плынь. Выйсцем са становішча падаліся якраз прымірэнчыя працэдуры. Мае ініцыятывы як навукоўца і ініцыятывы Вышэйшага Гаспадарчага Суда РБ прывялі да таго, што падрыхтоўка такога законапраекта была прадугледжана Планам падрыхтоўкі законапраектаў на 2010 г., і 12 ліпеня 2013 г. быў прыняты закон Рэспублікі Беларусь „Аб медыяцыі"», – працягвае загадчыца кафедры. Пасля працы над праектам закона і яго прыняццем з'явілася неабходнасць распрацаваць нацыянальныя праграмы падрыхтоўкі медыятараў, праводзіць трэнінгі. Гэтай працай і займалася Аксана Мікалаеўна з калегамі.

Як тлумачыць выкладчык, медыяцыя – універсальная з'ява, якая можа ўжывацца ў любой сферы грамадскіх адносін. Напрыклад, гэта сямейныя і зямельныя спрэчкі, працоўныя адносіны, эканамічная, экалагічная і іншыя сферы. Па словах Аксаны Здрок, мэта медыятара ў канфліктнай сітуацыі – дапамагчы бакам знайсці ўзаемавыгаднае рашэнне, але не прымірыць іх. Аднак гэта тонкая і прыгожая працэдура па яе завяршэнні ў шматлікіх выпадках дазваляе бакам паціснуць адзін аднаму рукі і аднавіць узаемаадносіны.

«Хутчэй за ўсё, медыятар – гэта перакладчык, які валодае мовай канфліктнай сітуацыі. Ён не дадае нічога ад сябе, не дае рэкамендацый і парад, а выкарыстоўвае камунікатыўныя тэхнікі (рэхапаўтор, перафразаванне, рэзюмэ і інш.), перакладае гэта так, каб бакі маглі пачуць адзін аднаго», – тлумачыць яна.

Сёння ў рэестры медыятараў Беларусі больш за 800 спецыялістаў. Практыка з 2008 года была рознай: выкарыстанне медыяцыі ў судах то паскаралася, то запавольвалася. Як гаворыць Аксана Мікалаеўна, спачатку былі вельмі добрыя вынікі па краіне, што дзівілі нават замежных калегаў, якія гаварылі пра «беларускі цуд». За год колькасць медыяцый, якія атрымлівалася разгледзець, вымяралася ў тысячах. Хоць у цэлым практыка па Еўропе нязначная – да 1 % спраў разглядаюцца ў медыяцыі. «Цяпер многія дзяржавы заклапочаны тым, як актывізаваць гэту працэдуру, зрабіць яе прывабнай для насельніцтва», – дапаўняе Аксана Здрок.

### «Мне падабаецца эўрыстычны метад тым, што ён уключае магчымасць выявіць індывідуальнасць»

Як распавядае выкладчык, цяпер яна больш займаецца тэарэтычнай і педагагічнай дзейнасцю, паколькі сумяшчаць усё проста не атрымалася. У падрыхтоўцы юрыстаў яна падкрэслівае актуальнасць новых методык навучання. Па меркаванні Аксаны Здрок, у сучасным праве патрэбныя спецыялісты, якія арыентаваны не толькі на традыцыйны судовы разгляд. Сёння становіцца зразумела, што судовая абарона павінна стаць выключным і апошнім сродкам, да якога звяртаюцца тады, калі іншыя сродкі не дапамаглі. Таму галіне неабходныя юрысты, якія здольныя зменшыць колькасць прававых разглядаў і ўмеюць вырашаць спрэчкі ў пазасудовым парадку. Аксана Мікалаеўна лічыць, што падрыхтаваць такога выпускніка дапаможа крэатыўнае навучанне, інавацыі і карэкціроўка зместу навучальных праграм.

Але і выкладчыку трэба ўдасканальвацца. Неабходныя веды па эўрыстычным навучанні яна атрымала год таму на павышэнні кваліфікацыі па адукацыйнай праграме рэктара БДУ *Андрэя Дзмітрыевіча Караля* «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава».

«Калі я пазнаёмілася з эўрыстычным метадам дзякуючы А. Д. Каралю, то ўбачыла вельмі шмат падобнага ў гэтых формах з навучаннем медыяцыі. Інавацыйныя метады былі мне блізкія: праца ў групах, рашэнне творчых задач. Я займаюся трэнінгавай працай у рамках медыяцыі з 2013 года, і праз мяне прайшла вялікая колькасць слухачоў. Заўважыла, што дзейнасны падыход сапраўды эфектыўны: калі чалавек праз дзейнасць, праз працу над задачай атрымлівае новыя веды, якія становяцца яго асабістымі ведамі, а не перададзенымі кімсьці. Важна адрозніваць веды і ўсведамленне. Другое магчымае толькі тады, калі чалавек прапусціў інфармацыю праз сябе. Мне падабаецца эўрыстычны метад тым, што ён уключае магчымасць выявіць індывідуальнасць. На мой погляд, гэта самая прывабная рыса дадзенай методыкі. Цяпер на кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права новы метад выкарыстоўваецца падчас выкладання такіх дысцыплін, як „Грамадзянскі працэс", „Выканаўчая вытворчасць", „Практычныя навыкі юрыста". Мы атрымліваем добрыя водгукі ад студэнтаў. Падчас падобных заняткаў няма ніводнага сумнага студэнта, усе ўключаны ў працу», – дзеліцца выкладчык.

Па выніках навучання на курсах павышэння кваліфікацыі Аксана Здрок распрацавала цэлы комплекс заданняў, які выліўся ў «Эўрыстычны дыялогавы практыкум па тэматыцы альтэрнатыўных спосабаў вырашэння спрэчак, медыяцыі, прымірэнчых працэдур» (пад агульнай рэдакцыяй рэктара БДУ Андрэя Караля).

У практыкуме мноства займальных і творчых задач. Напрыклад, студэнтам прапануецца распрацаваць сацыяльную рэкламу пра медыяцыю, стварыць эскіз білборда, скласці «Азбуку для медыятара-пачаткоўца», у якой на кожную літару алфавіта раскрывалася б паняцце ў сферы прававога рэгулявання медыяцыі, сфармуляваць рэкамендацыі па ўдасканаленні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб медыяцыі. А яшчэ ва ўяўным музеі медыяцыі ім прапануецца змясціць экспанаты і падрыхтаваць пра іх інфармацыю для экскурсавода. Прымерыць ролю вядучага інфармацыйна-забаўляльнай праграмы, якому трэба правесці інтэрв'ю з медыятарам-практыкам. Навучэнцы на падставе заканадаўства Рэспублікі Беларусь будуць аналізаваць, якія магчымасці існуюць па дасудовым урэгуляванні спрэчкі з прадаўцом, у якога набылі няякасны тавар. І многае-многае іншае. Таксама адзначым, што сёлета пачаў сваю працу навуковы гурток «Прымірэнчыя працэдуры», заснаваны ў тым ліку на прымяненні эўрыстычнага метаду.

«Думаю, гэты метад універсальны, – гаворыць яна. – Ведаю, што на іншых факультэтах ужо рыхтуюцца падобныя практыкумы, якія аб'яднае міжуніверсітэцкая серыя „Крэатыўная адукацыя". Так, эўрыстычнае заданне выглядае кароткім, заклікае да гульні, але ствараць яго няпроста. Трэба ўлічваць шмат прынцыпаў фармулёўкі, каб захапіць студэнта і атрымаць практычны вынік. Таму кірунак крэатыўнай адукацыі трэба развіваць, трэба праводзіць больш навучальных мерапрыемстваў, паколькі эўрыстычны метад – гэта тэхналогія, і ёй трэба вучыцца».

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**
**Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА**

# Вынікі конкурсу па прысуджэнні прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі 2019 г.

**ПА ВЫНІКАХ КОНКУРСУ ПА ПРЫСУДЖЭННІ ПРЭМІІ ІМЯ У. І. ПІЧЭТЫ** ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук у намінацыі **«Навука»** пераможцам прызнана работа «Цыкл работ, што абгрунтоўваюць канцэпцыю прававога рэгулявання прымірэнчых працэдур як сродку павышэння эфектыўнасці правасуддзя па грамадзянскіх і эканамічных справах». Аўтар: **Здрок Аксана Мікалаеўна** – загадчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт.

Пераможцам у намінацыі **«Навука» сярод маладых навукоўцаў** (дактары навук ва ўзросце да 45 гадоў) прызнана работа «Сукупнасць навуковых работ і вучэбных дапаможнікаў па псіхалагічных праблемах сацыялізацыі дзяцей з адхіленнямі ў развіцці». Аўтар: **Палякоў Аляксей Міхайлавіч** – прафесар кафедры псіхалогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук, доктар псіхалагічных навук, дацэнт.

Пераможцам у намінацыі **«Навука» сярод маладых навукоўцаў** (кандыдаты навук ва ўзросце да 35 гадоў) прызнана работа «Комплекс фундаментальных навукова-даследчых работ, якія прадстаўляюць метады і эмпірычныя вынікі вывучэння нацыянальнай ідэнтычнасці і гістарычнай памяці ў Беларусі і іншых краінах». Аўтар: **Фабрыкант Маргарыта Саулаўна** – дацэнт кафедры псіхалогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук, кандыдат псіхалагічных навук.

**ПА ВЫНІКАХ КОНКУРСУ ПА ПРЫСУДЖЭННІ ПРЭМІІ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ** ў галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук у намінацыі **«Навука»** пераможцам прызнана работа «Механізмы перадачы сігналаў і апрацоўкі інфармацыі ў клетачных сістэмах». Аўтары: **Марціновіч Рыгор Рыгоравіч** – загадчык кафедры біяфізікі фізічнага факультэта, доктар біялагічных навук, дацэнт; **Гарудка Ірына Уладзіміраўна** – дацэнт кафедры біяфізікі фізічнага факультэта, кандыдат біялагічных навук, дацэнт; **Дзянісаў Андрэй Анатольевіч** – загадчык НДЛ клетачнай інжынерыі і нанабіятэхналогій кафедры біяфізікі фізічнага факультэта, кандыдат біялагічных навук; **Чаранкевіч Сяргей Мікалаевіч** – прафесар кафедры біяфізікі фізічнага факультэта, доктар біялагічных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі.

Пераможцам у намінацыі **«Навука» сярод маладых навукоўцаў** (дактары навук ва ўзросце да 45 гадоў) прызнана работа «Кагерэнтныя хвалевыя эфекты ў аптычных метаматэрыялах і наноструктурах». Аўтар: **Навіцкі Андрэй Віктаравіч** – прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі фізічнага факультэта, доктар фізіка-матэматычных навук, дацэнт.

Пераможцам у намінацыі **«Навука» сярод маладых навукоўцаў** (кандыдаты навук ва ўзросце да 35 гадоў) прызнана работа «Планарныя вадкакрышталічныя элементы для прасторава-палярызацыйнага кіравання лазерным выпраменьваннем». Аўтары: **Кабанава Вольга Сяргееўна** – навуковы супрацоўнік НДЛ нелінейнай оптыкі і спектраскапіі кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі фізічнага факультэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук; **Рушнова Ірына Іванаўна** – дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі фізічнага факультэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук.

Пераможцам у намінацыі **«Навука» сярод маладых навукоўцаў** (без вучонай ступені ва ўзросце да 30 гадоў) прызнана работа «Устанаўленне механізмаў рэдакс-залежнай і стэроіднай рэгуляцыі плыняў макраэлементаў у корані вышэйшых раслін». Аўтар: **Грывусевіч Паліна Вацлаваўна** – малодшы навуковы супрацоўнік НДЛ фізіялогіі і біятэхналогіі раслін кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін біялагічнага факультэта.

# Сярэдні бал, замежная мова і матывацыйны ліст – галоўныя крытэрыі

**Як падаць заяўку на стажыроўку за мяжой, правільна запоўніць дакументы і выбраць праграму акадэмічнай мабільнасці?**

Студэнтаў, якія хацелі б правесці семестр ці больш у замежнай ВНУ і ўзбагаціцца прафесійным і моўным досведам, турбуюць такія пытанні. На іх падрабязна адказаў каардынатар праектаў мабільнасці БДУ і Універсітэта Кента (Вялікабрытанія) **Арцём НАЗАРАНКА.**

Сустрэчу ў межах EDU-тыдня зладзіў савет па якасці адукацыі гістарычнага факультэта. Праз такія сустрэчы студэнты даведваюцца пра магчымасці адукацыі за мяжой, а таксама дамовы БДУ з іншымі ўніверсітэтамі свету.

Акадэмічная мабільнасць – абмен навучэнцамі, супрацоўнікамі з замежнай адукацыйнай установай для паляпшэння іх прафесійнай і навуковай падрыхтоўкі, новага досведу, арганізацыі даследаванняў і педагагічнай стажыроўкі для выкладчыкаў. Мабільнасць заўсёды абмежавана па часе: семестр ці год навучання. БДУ мае дамовы з адукацыйнымі ўстановамі, без перабольшання, амаль па ўсім свеце. «Зараз найбольш папулярныя нашы міжуніверсітэцкія дамовы ў праграме Erasmus+ – ініцыятыве Еўрапейскага саюза, накіраванай на развіццё адукацыі і моладзі. Ці стыпендыяльныя праграмы, напрыклад, венгерскага, амерыканскага ўрадаў. Таксама ёсць неабсяжныя магчымасці набываць платныя адукацыйныя курсы за мяжой», – кажа Арцём.

У любой праграме акадэмічнай мабільнасці першае, што трэба зрабіць, – вызначыць канкрэтныя для сябе мэты і высветліць, як у іх дасягненні можа дапамагчы ўніверсітэт. Усю інфармацыю можна знайсці на сайце УМС БДУ і на спецыяльным рэсурсе mobility.bsu.by, якія падкажуць, як падрыхтавацца да паездкі і падаць правільны пакет дакументаў. Створана і брашура «Маладзевая мабільнасць – шлях да поспеху», якая знаходзіцца ў свабодным доступе.

## Колькі гэта каштуе?

Конкурс заўсёды праводзіцца на наступны год ці наступны семестр. У кастрычніку абвяшчаецца набор на вясенні семестр па Erasmus+, у красавіку-маі – на восеньскі. Гэта бясплатная адукацыйная праграма, але гэта не значыць, што яна не патрабуе выдаткаў. Студэнт не плаціць за адукацыйныя паслугі, а недзе яшчэ і атрымлівае стыпендыю. Напрыклад, 3-месячны грант у Вялікабрытанію з улікам усіх выдаткаў складае 2700€. Іх можа не хапіць, каб здымаць жыллё, харчавацца і хадзіць у музеі. «Але вы вызвалены ад абавязковай платы за навучанне для замежнага студэнта – каля 5000 фунтаў у семестр», – падкрэслівае Арцём.

## На што звяртае ўвагу камісія?

Хто са студэнтаў паедзе вучыцца за мяжу, вырашае на аснове конкурсу ўніверсітэт, які скіроўвае, то бок БДУ. Калі прымаючы ўніверсітэт задавальняюць абраныя кандыдатуры – а часцей за ўсё яны пагаджаюцца з выбарам БДУ, – студэнт трапляе ў праграму акадэмічнай мабільнасці. Што зрабіць, каб стаць абраным?



– Ацэньваюцца не канкурсанты, а іх заявачныя пакеты, – тлумачыць Арцём Назаранка. – Важна тое, што вы пра сябе паведаміле, таму якасць інфармацыі першасная. БДУ адбірае кандыдатаў яшчэ і таму, што яны – прадстаўнікі ўніверсітэта за мяжой. Другое пытанне: для чаго вам патрэбны ўдзел у акадэмічнай мабільнасці і чаму менавіта вас павінны абраць? Адказ звязаны з навуковай і прафесійнай дзейнасцю, якую вы як кандыдат ведзяце тут, у Беларусі. «Я марыла апынуцца ў гэтай краіне з дзяцінства» – зусім не аргумент. Як абраны вамі замежны ўніверсітэт дапаможа даследаваць вашу навуковую тэму ці скончыць дысертацыю? Як акадэмічная мабільнасць дапаможа стаць міжнародным менеджарам? Глабальная мэта акадэмічнай мабільнасці – даць той досвед і тыя кампетэнцыі, якія іншым шляхам нельга атрымаць. І, канешне ж, яны павінны быць карысныя для навучання.

## Што падрыхтаваць?

Сярэдні бал мае значэнне: напрыклад, гэта асноўнае, што можа паказаць першa- ці другакурснік. Ёсць і ўнутраныя абмежаванні праграм: напрыклад, падавацца толькі з балам ад 7 ці 8. Аснова – узровень валодання замежнай моваю не ніжэйшы за B2. «Калі не вучыце замежную мову – лічыце, што прафесійна сябе пахавалі, вы ніхто ў любой прафесіі», – цвёрда кажа Арцём. Важна паказаць пацвярджэнне валодання моваю, таму што навучанне будзе ісці не на рускай ці беларускай мовах. Для студэнтаў часцей за ўсё неабходная даведка з засвоенымі дысцыплінамі, у некаторыя ўніверсітэты – акадэмічная рэкамендацыя ад навуковага кіраўніка.

– Матывацыйны ліст адкажа чалавеку з камісіі, які прымае рашэнне, на пытанне, чаму вас трэба абраць на праграму і чым гэта для вас будзе карысна. Гэта аднязначна не «я ляжала дома, гледзячы "Шэрлака Холмса", і падумала, як я на "Усходнім экспрэсе" паеду за мяжу». Гэта, канешне, смешна, і такіх цікавостак у УМС набралася шмат. Ад вас чакаюць абгрунтаванне, чым вы будзеце там займацца і якая ад гэтага карысць у будучыні. Матывацыйны ліст і план навучання – тыя дакументы, дзе ў кандыдата ёсць рэальнае права голасу. Ён звяртаецца да канкрэтных людзей, якія іх будуць чытаць і прымаць рашэнні.

Не менш важны дакумент – план знаходжання за мяжой. Што вы збіраецеся здзейсніць за гэты тэрмін? Якія крокі да сваёй мэты – напісання навуковай працы ці іншае? Якія дысцыпліны збіраецеся вывучаць? Што вы вывучылі на родным факультэце і што збіраецеся вывучаць там? Павінен быць баланс паміж дысцыплінамі, якіх увогуле няма ў БДУ, і іх абавязковае спалучэнне са спецыяльнасцю, на якой вы навучаецеся тут. Напрыклад, у вас тут няма магчымасці даследаваць атлантычную падводную археалогію, а ў партугальскім універсітэце яна ёсць, але вы навучаецеся менеджменту. У такім выпадку вашай заяўцы хутчэй за ўсё адмовяць. Гэтак жа і ў матывацыйным лісце: якія навыкі, кампетэнцыі, што немагчыма атрымаць у Беларусі, вы плануеце набываць і скарыстоўваць у далейшым.

Плануючы графік заняткаў, памятайце, што ў заходнееўрапейскай сістэме навучання няма такога насычанага па прадметы раскладу, як у нас. У семестр больш за тры дысцыпліны цяжка сабе ўявіць, а чатыры – мяжа чалавечых магчымасцяў. Разлічвайце таксама, што вы будзеце займацца навуковай працай для курсавой ці дыплома.

Няма лепшага часу са студэнцтва, каб правесці пару месяцаў у іншым адукацыйным асяроддзі. У гэтым узросце лягчэй успрыняць адрозныя мадэлі: навучальныя, прафесійныя, чалавечыя, жыццёвыя. Гэта надзвычай важна і каштоўна для развіцця светапогляду.

«Мой заклік: глядзіце шырэй, магчымасцяў цяпер значна больш, геаграфія не абмежавана ўвогуле, вы можаце паўгода вучыцца нават у Японіі, Паўднёвай Карэі, Сінгапуры. Чым бы вы ні цікавіліся, па любой тэматыцы. Толькі карыстайцеся!» – дае наказ Арцём Назаранка.

**Надзея МАРХЕЛЬ**



УНІВЕРСІТЭТ
30 кастрычніка 2019 года, № 13 (2219)



*Каманда арганізатараў і ўдзельнікаў праграмы «Настаўнік для Беларусі» – гэта захопленыя людзі, якія любяць сваю прафесію*

# Як палепшыць школьную адукацыю

Сёлета пры ўдзеле супрацоўнікаў БДУ далі старт унікальнай праграме «Настаўнік для Беларусі», якая мае мэту, каб у кожнага вучня павінна быць магчымасць раскрыць свае здольнасці і таленты, нягледзячы на тое, у якой мясцовасці ён пражывае.

## Як сфарміравалася праграма «Настаўнік для Беларусі»?

Гісторыя пачалася з таго, што два сябры дзяцінства, выпускнікі Ліцэя БДУ Сяргей Бародзіч (скончыў філфак БДУ) і Зміцер Макарчук вырашылі паехаць працаваць настаўнікамі ў аграгарадок Капыльскага раёна. Пасля двух гадоў плённай дзейнасці яны вярнуліся працаваць у Ліцэй БДУ. Імкненне палепшыць школьную адукацыю захавалася. Яно вылілася ў задумку стварыць выдатны праект, каб вярнуць у школы людзей, для якіх на першым месцы стаіць праца з дзецьмі.

Больш за два гады Зміцер і Сяргей звярталіся ў розныя дзяржструктуры са сваімі ідэямі і прапановамі, аднак значным штуршком у гэтай гісторыі стала супрацоўніцтва з адной фінансавай установай. «Ашчадбанк» Расіі падтрымлівае праект «Настаўнік для Расіі». «Можа, такі ж запусціць у Беларусі?» – падумалі супрацоўнікі «БПС-Ашчадбанка». Пачуўшы пра гэта ў навінах, Зміцер і Сяргей з ідэямі звярнуліся ў банк, у якім ужо стваралася рабочая група для распрацоўкі канцэпцыі праекта ў Беларусі. Там зацікавіліся вопытам маладых настаўнікаў, праца закіпела. Банк зарэгістраваў юрыдычную асобу – мясцовы адукацыйны фонд «Новая школа», а ў маі гэтага года было падпісана пагадненне з Міністэрствам адукацыі. З тых часоў праект працуе ў рэжыме нон-стоп.

## Што трэба ведаць пра сутнасць праекта, удзельнікаў і іх працу?

Праграма прадугледжвае, што выпускнікі ВНУ на 2 гады становяцца настаўнікамі ў аддаленых сельскіх школах, дзе вучням асабліва патрабуюцца натхняльныя педагогі, а калектыву – новыя кадры. Задача крэатыўнага і неабыякавага настаўніка ў такім становішчы – павысіць цікавасць да школьнай адукацыі, дапамагчы вучням знайсці матывацыю да вучобы.

У наборы 2019 г. стаць удзельнікам мог кожны, хто за плячыма меў педагагічную адукацыю і жаданне працаваць з дзецьмі, выкарыстоўваючы інфармацыйныя і адукацыйныя тэхналогіі. Канкурсант запаўняў анкету, указваў асабістыя звесткі, пісаў эсэ пра матывацыю... Пасля прагляду заявак арганізатары адбіралі ўдзельнікаў на сустрэчу, выяўлялі дадатковую інфармацыю пра іх. Далей – вочны тур з практыкаваннямі на каманднае ўзаемадзеянне, крэатыўнасць, камунікацыю. Таксама ўдзельнікі праводзілі ўрок на 7 хвілін. Пасля – індывідуальнае сумоўе.

З 60 заявак было адабрана 12 педагогаў для ўдзелу ў месячным летнім інтэнсіве. Тут удзельнікі асвойвалі сучасныя падыходы да педагогікі і выкладання, паляпшалі асабістыя якасці, атрымлівалі веды ў праектным менеджменце. Арганізатары імкнуліся ахапіць як мага большы спектр людзей, зацікаўленых ва ўдасканальванні сістэмы адукацыі. Яны падрыхтавалі разнастайную праграму лекцый, практычных заняткаў, сустрэч з найлепшымі спікерамі са сферы бізнесу, менеджменту, адукацыі. Сваім вопытам дзяліліся ў тым ліку спецыялісты БДУ. На апошнім тыдні ўдзельнікі самастойна з нуля распрацоўвалі летнік «Навыкі 21 стагоддзя» для дзяцей на базе СШ № 20 г. Барысава. Яны складалі праграму, распаўсюджвалі інфармацыю, дамаўляліся наконт транспарту, адбіралі дзяцей з горада і раёна. Справіліся выдатна, усе бакі засталіся задаволенымі. Можна лічыць, што іспыт здалі.

Пасля інтэнсіву прымалі канчатковае рашэнне: 9 педагогаў накіраваны на працу ў 5 рэгіянальных школ у Кобрынскім, Бярэзінскім, Дзяржынскім, Чэрвеньскім раёнах і горадзе Дзяржынск. Гэта настаўнікі рознага профілю: педагог-псіхолаг, настаўнікі гісторыі і грамадазнаўства, інфарматыкі, рускай мовы і літаратуры, біялогіі, хіміі, беларускай мовы і літаратуры, фізічнай культуры, пачатковых класаў. Як адзначаюць арганізатары, з 24 заявак, якія прыйшлі ад школ, на здзіўленне, выявілася, што не хапае 18 настаўнікаў матэматыкі. Гэты недахоп каманда паспрабуе выправіць у наступным годзе і знайсці патрэбныя кадры.

Далей удзельнікам праграмы будзе аказвацца два віды падтрымкі. Нематэрыяльная – у кожнага настаўніка ёсць праектны менеджар, метадыст і асабісты куратар. І матэрыяльная – кожнаму акрамя зарплаты будзе два гады налічвацца стыпендыя – 250 рублёў. Іх таксама забяспечаць ноўтбукамі і кампенсуюць расходы на жыллё пры неабходнасці пераезду. Яшчэ ўдзельнікі будуць штомесяц (ці нават часцей) сустракацца і абменьвацца інфармацыяй. Перад імі апроч іншага стаіць задача зрабіць нейкі значны праект для лакальнай супольнасці.

**Зміцер МАКАРЧУК, удзельнік каманды арганізатараў, супрацоўнік ліцэя БДУ, магістрант кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ:**

– Перад тым, як ва ўдзельнікаў стартаваў навучальны год, беларуская каманда арганізатараў пазнаёмілася з расійскай мадэллю праекта на летнім інтэнсіве. У расіян тады ішоў 5 набор педагогаў, за 3 дні апыталі каля 30 чалавек, якія займаюць розныя пасады ў структуры. Беларускую лакальную праграму адрознівае ад замежнага руху тое, што там адбіраюць для ўдзелу не толькі настаўнікаў, але і людзей, у якіх няма педагагічнай адукацыі. У расійскага праекта заключана пагадненне з Інстытутам адукацыі «Вышэйшай школы эканомікі», куды залічваюцца ўдзельнікі праграмы. Яны 2 гады працуюць у школе, а таксама здаюць іспыты, пасля атрымліваюць сертыфікат аб праходжанні перападрыхтоўкі на педагагічны профіль.

У беларускага праекта пакуль у планах зрабіць нешта падобнае. Магчыма, на базе БДУ будзе створана такая ж праграма: на факультэце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ці на кафедры педагогікі і праблем адукацыі як магістратура. Было б выдатна зрабіць праект даступным для ўсіх таленавітых людзей, якія маюць імпэт і хочуць дзяліцца сваім захапленнем з дзецьмі. Мы хочам, каб настаўнікі горда неслі сваё званне. Адчуванне, што словы і ўчынкі выхоўваюць дзяцей, будучае пакаленне, вартае шмат чаго.

**Сяргей БАРОДЗІЧ, удзельнік каманды арганізатараў, настаўнік рускай мовы і літаратуры ў прыватных школах:**

– Калі мы аналізавалі, чаму маладыя спецыялісты пасля двух гадоў працы з'язджаюць са школы ці шукаюць іншую сферу, то зразумелі, што гэта звязана з тым, што за гэты час яны не знайшлі падтрымкі. Калі мы са Змітром Макарчуком паехалі ўдваіх у вёску, мы на сабе адчулі гэты момант. Зусім іншая справа, калі ты не адзін. Зыходзячы з нашага прыкладу, мы пераканаліся, што ўдзельнікам мэтазгодна ехаць у школы мінімум па двое – гэта важная асаблівасць праграмы.

Хочацца, каб нашы калегі прапрацавалі на сваіх месцах не толькі пару гадоў, а ўжо надоўга затрымаліся ў сістэме адукацыі. І каб школы былі гатовыя да такіх актыўных работнікаў. Для нас важна пабудаваць супольнасць настаўнікаў, якія б успрымалі сябе як агульнасць, як прадстаўнікоў новага пакалення ў прафесіі. Калі ўспрыманне настаўніка як чалавека ў грамадстве памяняецца, для нас гэта будзе перамога.

**Алена АЛЕХНА, удзельніца праекта, настаўніца рускай мовы і літаратуры, скончыла завочнае аддзяленне філфака БДУ ў 2019 годзе:**

– Я цяпер жыву і працую ў пасёлку Энергетыкаў Дзяржынскага раёна. Тут жа са мной працуе яшчэ адна ўдзельніца праекта – настаўніца інфарматыкі Людміла Рыбчынская (гэта яе ранейшае месца працы, яна падавалася ў праграму разам са школай). Філолагаў чакалі толькі ў дзвюх школах. У мяне быў выбар: ехаць сюды ці ў Чэрвеньскі раён. Акалічнасці склаліся так, што я апынулася ў гэтым мястэчку. У любым выпадку збіралася пераязджаць, было непрынцыпова, куды менавіта. Да праекта працавала педагогам-арганізатарам, але хацела быць менавіта настаўніцай рускай мовы і літаратуры, а на старым месцы працы ўсе вакансіі былі занятыя. Пераезд не палохаў, іх у маім жыцці было нямала.

Пра праект «Настаўнік для Беларусі» даведалася ў пачатку чэрвеня падчас падрыхтоўкі да дзяржэкзаменаў, убачыла аб'яву ў сацыяльных сетках. Зацікавілася, зразумела, якая гэта выдатная ідэя. Паколькі настаўнікі сыходзяць з сістэмы адукацыі (прычым такая тэндэнцыя намецілася не толькі ў нашай краіне), а прыцягнуць спецыяліста ў вёску складаней, чым у горад, дзе ёсць пэўныя плюсы, я зразумела, што гэта праграма вельмі патрэбная. Мне цікавыя складанасці ў жыцці, разумею, што менавіта яны нас развіваюць. Да таго ж, у першую чаргу для мяне была важная галоўная ідэя праекта: каб неабыякавыя настаўнікі былі гатовыя змяняцца для паляпшэння сістэмы адукацыі з мэтай максімальнага развіцця патэнцыялу ў дзецях.

Патроху ўкараняю на сваіх уроках тое, чаму нас вучылі на летнім інтэнсіве. Каманда арганізатараў і ўдзельнікаў праграмы «Настаўнік для Беларусі» – гэта захопленыя людзі, якія любяць сваю прафесію. Упэўнена, маё жыццё не будзе ранейшым. Гэта праграма ўжо змяніла мяне, я стала больш упэўненай у сабе, разумею, што самае цудоўнае яшчэ наперадзе. Чакаю, што дзеці, з якімі я працую, стануць шчаслівейшымі. Спадзяюся, яны будуць тымі людзьмі, якія здольныя вырашаць пытанні ў любой сферы: і асабістай, і прафесійнай. Галоўнае, каб у іх сфарміравалася разуменне: змены да найлепшага ў свеце пачынаюцца з кожнага з нас.

**Дыяна КАНДРАЦЮК, амбасадарка праекта «Настаўнік для Беларусі», магістрантка кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ:**

– Мы хочам бачыць таксама і студэнтаў, і выкладчыкаў БДУ ў праекце – у ролі ўдзельнікаў ці ў якасці падтрымкі і супрацоўніцтва. Наша кафедра аб'яднала сілы і сувязі вакол праекта, так і я далучылася да яго праз кафедру. Загадчыца Вольга Леанідаўна Жук праводзіла практыкум і семінары на летнім інтэнсіве. Я ведаю удзельнікаў праекта, натхняе іх энергія і ініцыятыўнасць, хочацца гэтак жа трапятліва ставіцца да сваёй справы, як і яны.

Трэба адзначыць, што праект становіцца прывабнай пляцоўкай для размеркавання і выпускнікоў БДУ, дасведчаная каманда дапаможа знайсці сябе ў прафесіі. Запамінайце: з пачатку 2020 года можна запаўняць анкету на ўдзел у наступным сезоне праекта. Сачыце за навінамі праграмы на афіцыйным сайце teach4.by.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

Праграміст паглыбляецца ў генетыку, а хімік спасцігае юрыдычныя тонкасці: з пачатку навучальнага года студэнты БДУ атрымалі магчымасць вывучаць дадатковыя дысцыпліны на выбар – без прывязкі да курса ці факультэта. Мы пагаварылі з тымі, хто часткова ўзяў складанне навучальнага раскладу ў свае рукі.



# На стыку дысцыплін

**Лізавета КУЦЮН, 5 курс біяфака:**

– Вывучэнне дадатковых дысцыплін на іншых факультэтах дазваляе пашырыць веды ў розных галінах і ў далейшым пасляхова іх прымяняць, таму я была рада нововаўвядзенням. На біялагічным факультэце студэнты вывучаюць псіхалогію, аднак на маёй спецыяльнасці выкладаюць толькі яе асновы. Мне ж стала цікава вывучыць асобныя кірункі псіхалогіі для агульнага развіцця асобы, і я абрала «Псіхалогію развіцця» на ФФСН. Валодаць псіхалагічнымі прыёмамі карысна для спецыялістаў любой сферы. Веданне дадзенага прадмета дапаможа пасляхова праходзіць сумоўе пры працаўладкаванні.

**Аляксандр КРАКАСЕВІЧ, 4 курс ФМА:**

– Я вучуся на спецыяльнасці «менеджмент» па кірунку «менеджмент у сферы міжнароднага турызму», аднак мяне таксама заўсёды цікавіла права. Падчас навучання шукаў магчымасць сумясціць вывучэнне права са сваёй асноўнай спецыяльнасцю, і вось яна з'явілася. У гэтым семестры я абраў чатыры дысцыпліны на сваім жа факультэце, але па іншым кірунку – «Гісторыя дзяржавы і права замежных краін», «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», «Агульная тэорыя права», «Канстытуцыйнае права Беларусі». Студэнты нават адной спецыяльнасці могуць пераследваць абсалютна розныя мэты ў сваім кар'ерным развіцці. Для мяне дадатковыя дысцыпліны – гэта спосаб вызначыцца, наколькі актуальнае вывучэнне права як другой спецыяльнасці. Вывучаючы дадатковыя дысцыпліны, вядома, не атрымаеш яшчэ аднаго дыплома, але гэта добры варыянт пашырыць свой далягляд і ўзмацніць прафесійную падрыхтоўку. А для студэнтаў, якія сумняваюцца ў абранай асноўнай спецыяльнасці, гэта шанец паспрабаваць сябе ў чымсьці новым.

**Мікіта ВУШАЎ, 3 курс ФПМІ:**

– Я лічу, што сучасныя абставіны складваюцца такім чынам, што, каб быць запатрабаваным спецыялістам, ужо мала мець адну адукацыю, адну прафесію на ўсё жыццё. Чым больш ты ведаеш, тым лепш, таму я з вялікім энтузіязмам паставіўся да магчымасці паспрабаваць вывучыць дадатковыя дысцыпліны. Сёння ў сусвеце тэма біяінфарматыкі дастаткова папулярная, у біялагічнай сферы выкарыстоўваюцца розныя «айцішныя» метады і алгарытмы аптымізацыі, таму я зразумеў, што мне як праграмісту цікава паспрабаваць дазнацца, што гэта за навука такая генетыка, і абраў яе вывучаць на біяфаку ў якасці дадатковай дысцыпліны. Я нават планую на другі семестр браць курс геномікі, каб вывучаць больш падрабязна ўжо саму ДНК.

**Любоў МАСЛАВА, 4 курс хімфака:**

– Магчымасць вывучаць дадатковыя дысцыпліны – добры шанец паспрабаваць трохі адысці ад звыклага курса навучання і пашырыць галіну ведаў, паглыбіцца ў пытаннях, якія цікавяць. Напрыклад, у прыродазнаўчых навуках ёсць вельмі шмат кропак судакранання, і іх вывучэнне не варта абмяжоўваць толькі прапанаванымі на факультэце курсамі, таму што яны знаходзяць прымяненне і ў так званых «гуманітарных» сферах дзейнасці. Можна выбраць, паспрабаваць, знайсці адказы ў большай колькасці прафесіяналаў, выкарыстаць уласныя веды ў новай плоскасці, паглядзець на праблему з кардынальна іншага пункта гледжання. Я абрала «Практыкум па мытных даследаваннях і экспертызе» на ФМА, што дапамагло мне азнаёміцца з юрыдычнымі асновамі экспертызы ў цэлым, а экспертная дзейнасць для спецыяліста-хіміка часцей за ўсё з'яўляецца асноўным кірункам працы. Лабараторныя заняткі дазваляюць адчуць такую працу на сабе і ў далейшым больш усвядомлена падыходзіць да выбару месца працы. Думаю, у наступным семестры абяру яшчэ адну дысцыпліну. Лічу, што такой магчымасцю трэба абавязкова карыстацца, і нават крыху шкадую, што гэта мой выпускны курс.

Сесія для тых, хто вывучае дадатковыя дысцыпліны, будзе даўжэйшая: па абраных прадметах неабходна будзе здаць залік ці іспыт. Па выніках станоўчай атэстацыі дадатковыя курсы ўнясуць у дадатак да дыплома. Калі ж студэнт атрымае нездавальняльную адзнаку ці «не залічана», яму выдадуць даведку пра праслуханую дысцыпліну.

Калі ў вас з'явілася жаданне атрымаць дадатковыя веды на іншым факультэце ўжо ў наступным семестры, неабходна:

– абраць дысцыпліну для вывучэння;

– напісаць заяву, атрымаць дазволы дэкана свайго факультэта і дэкана таго факультэта, на якім вы хочаце вывучаць дысцыпліну;

– пасля атрымання дазволаў аплаціць (у залежнасці ад колькасці заліковых адзінак дысцыпліны (ад 24,60 да 73,80 руб.) і формы атэстацыі (ад 3,80 да 5,40 руб.));

– падаць заяву ў Галоўнае ўпраўленне адукацыйнай дзейнасці (рэктарат, вул. Бабруйская, 5а) з квітанцыяй пра аплату да 25 студзеня 2020 г.

**Валерыя БАНДАРЧЫК**

# Хто найбольш запатрабаваны?

Студэнты факультэтаў прыкладных навук сталі ўдзельнікамі дня кар'еры, які прайшоў 17 кастрычніка на эканамічным факультэце БДУ. Яны даведаліся пра наяўнасць вакантных месцаў, перспектывы працаўладкавання і магчымасці стажыровак і практык, наведалі лекцыі і майстар-класы.



На мерапрыемстве было прадстаўлена больш за 10 беларускіх і міжнародных арганізацый: кансалтынгавыя фірмы, банкі і IT-кампаніі, дзе зацікаўленыя змаглі пазнаёміцца са спецыфікай дзейнасці кожнай з іх. Студэнты паразмаўлялі з патэнцыйнымі працадаўцамі, задавалі пытанні, запаўнялі рэзюмэ і анкеты суіскальнікаў.

Дарэчы, пра рэзюмэ. У рамках дня кар'еры адбыўся майстар-клас, у якім **Ганна ШАГУН,** кіраўнік PR-праекта РАБОТА.TUT.BY, распавяла пра тое, як знайсці працу і якасна скласці рэзюмэ.

Такім чынам, ніжэй спіс дзеянняў, які аптымізуе пошукі працы, нават калі вы студэнт без досведу:

1. Вучыцеся! Думаю, не варта нагадваць пра тое, што самым неацэнным сёння з'яўляюцца нашы веды. Якая б лічба ні стаяла ў вас у пашпарце, вашы ўменні і навыкі заўсёды павінны заставацца актуальнымі.

2. Улічвайце сітуацыю на рынку працы і вызначце свае перавагі. Зрабіце research на тэму таго, якія прафесіі цяпер запатрабаваныя і, зыходзячы з сітуацыі на рынку працы, прапануйце свае навыкі. Так, структура рэзюмэ за 3 квартал 2019 года РАБОТА.TUT.BY гаворыць пра тое, што 23 % усіх апублікаваных рэзюмэ належыць студэнтам, якія знаходзяцца ў пачатку шляху сваёй кар'еры, 14,6 % – суіскальнікам з перспектывамі ў продажах, 6,4 % шукаюць працу ў сферы лагістыкі і транспарту. Структура вакансій на сайце паказвае трохі іншую карціну: за 3 квартал 2019 года 26,9 % вакансій належыць сферы продажаў, 12,7 % шукаюць суіскальнікаў у якасці працоўнага персаналу, крыху менш, 12,2 %, – з досведам працы ў IT і інтэрнэце. Найменшым попытам у працадаўцаў карыстаюцца спецыялісты ў сферы аўтамабільнага бізнесу.

3. Выкарыстоўвайце як мага больш спосабаў пошуку працы. Гэта могуць быць як спецыялізаваныя сайты па пошуку працы, так і групы кампаній у сацыяльных сетках. Адзначым, не менш эфектыўны пошук на сайтах кампаній, пасродкам нэтворкінгу разнастайных майстар-класаў, практык і стажыровак, кадравых агенцтваў.

4. Складзіце добрае рэзюмэ. У гэтым пункце варта ўлічыць некаторыя рэкамендацыі:

• Падладжвайце рэзюмэ пад вакансію працадаўцы. Вакансіі адной і той жа катэгорыі могуць адрозніваца розным наборам навыкаў, якія шукаюць працадаўцы. Уважліва вывучыце патрабаванні працадаўцы і ў сваім рэзюмэ пакажыце ў першую чаргу тыя навыкі, якія з'яўляюцца прынцыпова важнымі для наймальніка.

• Заўсёды пішыце мэту рэзюмэ – назву пасады, на якую прэтэндуеце.

• Указвайце актуальныя спосабы сувязі з вамі. Гэта можа быць ваш нумар мабільнага тэлефона ці афіцыйны адрас электроннай пошты.

• Паказвайце свае дасягненні на папярэдніх месцах працы, выкарыстоўваючы лічбы і дзеясловы. Калі ж досведу ў вас няма, адаптуйце свае навыкі, атрыманыя на практыцы / стажыроўцы, у якасці валанцёра, пад навыкі, якія патрабуюцца ў вакансіі.

• Досвед працы заўсёды пішыце ў зваротным храналагічным парадку (2019, 2018, 2017...).

• Надайце ўвагу фатаграфіі: яна павінна быць актуальнай, з нейтральным фонам і адпавядаць пасадзе, на якую прэтэндуеце. Бо пагадзіцеся, што наўрад ці працадаўца будзе вас разглядаць у якасці менеджара, пераглядзеўшы рэзюмэ з фота, якое назавеш не інакш як «Мы. Турцыя, 2016».

• Пазбягайце абрэвіятур у назвах скончаных навучальных устаноў і папярэдніх месцаў працы.

• Тлумачце працяглыя перапынкі ў працы (стажыроўкі, навучанне).

• Павышайце сваю эфектыўнасць суправаджальным лістом. У ім коратка апішыце вашу матывацыю працы менавіта ў гэтай кампаніі і чым вы можаце быць карысныя.

5. Хадзіце на сумоўі. Напэўна, гэта самы відавочны і эфектыўны спосаб атрымаць працу мары. Будзьце спакойныя і ўпэўненыя ў сваіх сілах – і вы абавязкова зловіце ўдачу за хвост!

І трохі лічбаў. Статыстыка абвяшчае: 30 % суіскальнікаў засталіся ў кампаніях, у якіх праходзілі практыку. Таму да пытання пра практыку раяць ставіцца сур'ёзна.

**Алёна АГАРОДНІК**

Універсітэт
30 кастрычніка 2019 года, № 13 (2219)

# Дзень маці ў БДУ



**Кожны год БДУ святкуе Дзень маці: гэта не толькі павага да родных, а яшчэ і шанаванне выкладчыц і супрацоўніц універсітэта. Як прайшла галоўная імпрэза агульнаўніверсітэцкага свята і які сэнс у яе ўкладаюць арганізатары, даведалася газета «Універсітэт».**

Акцыю ў галоўным корпусе БДУ «Павіншуем нашых мам разам» падрыхтавалі УВРМ, студпрафкам БДУ і цэнтр валанцёрскай дзейнасці ўніверсітэта. Кожны мог падпісаць прыгожую паштоўку з кранальным малюнкам. «Дызайн на свята вось ужо некалькі гадоў распрацоўвае студэнтка *Марыя Бухцеева*. Раней мы выкарыстоўвалі таксама і канверты, якія адпраўлялі па розных кропках Беларусі – да мам студэнтаў. Аднак шмат лістоў вярталася назад, таму мы вырашылі наўпрост аддаваць паштоўкі маладым людзям, каб дома яны асабіста павіншавалі матулю», – кажа **Дар'я СПЯЦАНАВА,** намесніца старшыні прафкама.

Да напісаных слоў падзякі можна дадаць і кветкі, якія не завянуць. Майстар-клас па стварэнні прыгожых кветак з фаамірану правялі дзяўчаты з цэнтра валанцёрскай дзейнасці БДУ. Так, неўзабаве з-пад іх рук з'явіліся цэлыя букеты руж, гіяцынтаў, калаў. З ахвотай кветкі майстравалі хлапчукі, а некаторыя з захапленнем прасілі падараваць хоць некалькі штучак такой прыгажосці і радасныя ішлі дадому. Студэнтка біялагічнага факультэта **Дар'я АГАРОДНІКАВА** прызнаецца, што кветкі рабіць нескладана, і сама з радасцю дапамагае іншым. Пасля пар яна вядзе заняткі з пенсіянерамі, вучыць іх маляваць, і ад настаўніцтва атрымлівае вялікае задавальненне.

Важнасць штогадовага святкавання Дня маці для ўніверсітэта падкрэслівае кіраўніца цэнтра і начальніца аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ **Наталля ЯРАШЭВІЧ:**

– Мама – тая, хто знаходзіцца з чалавекам яшчэ да яго нараджэння. Трэба памятаць, што мамы нам даюць роўна столькі, колькі могуць даць. Бываюць цяжкія сітуацыі ў сем'ях студэнтаў, але заўсёды знайдзіце, за што падзякаваць. Напрыклад, за тое, што мы зараз жывём і ў нас ёсць магчымасці для рэалізацыі сябе.

Так зрабілі студэнты факультэта журналістыкі на відэа, дзе расказваюць пра асацыяцыі са сваімі мамамі. Шмат цікавага і прыемнага напісалі ўдзельнікі святочнага фотаконкурсу ад прафкама. У намінацыі на найлепшы фотаздымак з мамай выйграла *Анастасія Чарных* з першага курса ФФСН.

Фундаментальная бібліятэка БДУ таксама зрабіла цікавую акцыю «Матуліна кніга», якая захапіла не толькі студэнтаў, але і выкладчыкаў, адміністрацыю БДУ.

– Я хацела зрабіць нешта незвычайнае, – кажа супрацоўніца Фундаментальнай бібліятэкі, жонка і маці **Кацярына РОЎДА**. – Гэта акцыя паказвае ролю кнігі ў станаўленні асобы, і сувязь маці і дзіцяці праз кнігу, праз чытанне. Патрэбна было напісаць пра сваю матулю і кнігу, якая асацыюецца з дзяцінствам. Часцей за ўсё гэта былі народныя казкі і байкі, «Чараўнік Ізумруднага горада» А. Волкава. Напрыклад, «Маленькі прынц» Экзюперы – улюбёная кніга дырэктара бібліятэкі Уладзіміра Кулажанкі.

Мерапрыемствы да Дня маці прайшлі амаль на кожным факультэце БДУ. Чакаем чэрвеня, каб адзначыць Дзень бацькі.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

# Самае галоўнае – гэта кухня!

## Як харчуюцца студэнты БДУ ў новым інтэр'еры?

Тэма якаснага і недарагога харчавання заўсёды хвалюе студэнтаў, і ва ўніверсітэце гэта выдатна разумеюць.

За апошні час кардынальна абнавіліся сталовыя ў галоўным корпусе ўніверсітэта і на хімічным факультэце, змены адбіліся таксама на меню і коштах. Але галоўнае – памяняліся падыходы да арганізацыі спраў у гэтай сферы. Так, цэнтр грамадскага харчавання БДУ супрацоўнічае з італьянскім сыраробам Энца Гросі, які нядаўна правёў майстар-клас для работнікаў ЦГХ. Пра апошнія новаўвядзенні нам распавяла начальнік цэнтра **Марына ГЛУШАКОВА**.

***– Марына Уладзіміраўна, як часта вы праводзіце падобныя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне прафесійнага майстэрства сваіх супрацоўнікаў?***

– З маладымі спецыялістамі навучанне праводзіцца штодня. Для ўчарашніх студэнтаў усе стравы новыя, і навучаюць юных кухараў ужо сталыя правераныя кадры. Працэс ніколі не стаіць на месцы. Мы шукаем і распрацоўваем штосьці новае разам з загадчыкамі вытворчасцяў, уводзім навінкі і далей вывучаем попыт. Калі попыт ёсць, то страва застаецца ў нашым меню. Такога ж маштабу мерапрыемствы (з запрошаным экспертам) праводзяцца 1–2 разы на год. Заўсёды хочацца чагосьці асаблівага да новага навучальнага года. Летась акцэнт быў зроблены на беларускую кухню. А сёлета, зыходзячы з пажаданняў студэнтаў, спынілі выбар на простых, смачных, хуткіх у гатаванні стравах з вялікай колькасцю сыру. Галоўным чынам гэта хуткія перакусы.



*Справа налева: начальнік ЦГХ БДУ Марына Глушакова, Энца Гросі і нам. начальніка ЦГХ па вытворчасці Аксана Чаўнёнак*

***– Распавядзіце пра вашы ўражанні ад майстар-класа з Энца Гросі. Чаму вы запрасілі менавіта яго?***

– Вучыцца кулінарнаму мастацтву трэба ў прафесіянала. Дзякуючы майстар-класу нашы кухары і даведаліся сёе-тое новае, і ўдасканалілі свае навыкі ва ўменні гатаваць. З прадпрыемствам ТАА «Вітэрфуд», уладальнікам і дырэктарам якога з'яўляецца Энца, мы плануем супрацоўніцтва, а менавіта атрымліваць высакаякасныя сыры, прыгатаванне страў з беларускага малака, але па італьянскіх рэцэптах. Тыя стравы, якія былі прадэманстраваны на майстар-класе, безумоўна, з'явяцца ў нашым меню.

***– Як, увогуле, складаецца меню? Што вы ўлічваеце пры яго фарміраванні?***

– Правіла для меню – гэта разнастайнасць. Разнастайнасць можа заключацца ў відах сыравіны (мяса, рыба, птушка, агародніна і інш.), а таксама ў спосабе апрацоўкі (смажанае, тушанае, адварное і інш.). Вывучэнне попыту – адзін з асноўных фактараў выбару страў пры складанні меню. Мы імкнёмся прапанаваць тыя стравы, якія наведніку падабаюцца больш за ўсё.

***– Што змянілася ў асартыменце і ў плане арганізацыі працоўнага працэсу ЦГХ пад вашым кіраўніцтвам?***

– Самая галоўная змена – гэта тое, што грамадскае харчаванне БДУ зараз з'яўляецца структурай самога ўніверсітэта. Мы ўсталявалі сучасныя кававыя апараты, у меню з'явіліся фірмовыя стравы, у буфетах разнастаілі асартымент ласункаў на любы кашалёк (як для тых, у каго 20 капеек, так і для тых, у каго крыху больш).

Акрамя таго, яшчэ да мінулага навучальнага года быў абноўлены інтэр'ер у сталовай № 2 на вул. Ленінградскай, 14. Думаю, студэнты і супрацоўнікі хімічнага факультэта ацанілі выгляд абедзеннай залы.

***– Распавядзіце трохі пра калектыў. Можа, вы хацелі б кагосьці вылучыць?***

– Калектыў цэнтра грамадскага харчавання БДУ унікальны! Нам каштоўны кожны супрацоўнік. Асаблівая падзяка тым, хто працуе ўжо шмат гадоў. Гэта і кухары, і прадаўцы, і людзі, чыя праца на першы погляд непрыкметная, але без якіх не будзе камфортнага знаходжання ў сталовых – гэта нашы мыйшчыкі посуду і прыбіральшчыкі. Ёсць ужо спрацаваныя, пастаянныя калектывы пад кіраўніцтвам дасведчаных загадчыкаў вытворчасцяў: Клімовіч Марыі Фёдараўны, Латыголец Ірыны Іванаўны, Мацавіла Ніны Канстанцінаўны. Мы таксама заўсёды рады бачыць маладых спецыялістаў і новых работнікаў.

***– Вы з'яўляецеся адным з універсітэцкіх прадпрыемстваў, якое павінна прыносіць прыбытак. Акрамя забеспячэння харчаваннем студэнтаў, на чым яшчэ вы зарабляеце? Ці праводзяцца ў сталовых мерапрыемствы, і якія камерцыйныя прапановы да вас паступаюць?***

– Мы прымаем замовы на правядзенне ўрачыстых мерапрыемстваў: вяселлі, юбілеі, дні нараджэння і інш. Таксама ўдзельнічаем у розных мерапрыемствах, а менавіта ажыццяўляем выязны гандаль. Сёлета мы забяспечвалі харчаваннем валанцёраў II Еўрапейскіх гульняў. Акрамя ўсяго пералічанага яшчэ арганізоўваем кава-паўзы, фуршэты і шматлікае іншае.

***– Якія пераўтварэнні вы яшчэ хацелі б ажыццявіць?***

– Планы самыя амбіцыйныя! Як у любой установе грамадскага харчавання, галоўнае – гэта кухня. Цяпер усе нашы намаганні кінуты менавіта сюды. Гэта падбор і навучанне новага штата, павышэнне кваліфікацыі ўжо наяўнага. Таксама вядзецца актыўная праца з пастаўшчыкамі. Галоўная наша задача – задаволіць нашага студэнта, самага патрабавальнага і самага важнага для нас наведніка.

**Анастасія БАЛТОЎСКАЯ**

Універсітэт
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

30 кастрычніка 2019 года
Падпісана да друку 29.10.2019 г.
Зак. 637. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспл. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***